ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 11 (571) | Субота, 7 красавіка 1984 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап

## З ВДНГ — НА МІЖНАРОДНУЮ ВЫСТАЎКУ

Больш трох месяцаў на ВДНГ СССР была адкрыта тэматычная выстаўка «Універсітэты—вядучыя вучэбна-метадычныя і навуковыя цэнтры краіны». На ёй былі прадстаўлены разнастайныя экспанаты 45 універсітэтаў саюзных рэспублік.

Днямі з выставачнага камітэта прыйшла прыемная вестка. ГДУ ўзнагароджаны дыпломам III ступені ВДНГ СССР. Тром экспанатам прысуджаны бронзавыя медалі. Такой узнагароды ўдастоены «Спецыялізаванае відыякантралюючае прыстасаванне», зробленае на кафедры фізічнай метралогіі пад навуковым кіраўніцтвам І. Якаўцава студэнтамі-выпускнікамі Уладзімірам Крушавым і Марынай Якімовіч; «Універсальны вымяральнік амплітуд высокачастотных сігналаў» (аўтары —загадчык кафедры радыёфізікі дацэнт І. Ф. Дабравольскі і старшы навуковы супрацоўнік В. А. Яцкевіч); «Універсальны велаэргометр» (аўтары — старшы выкладчык кафедры фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны В. Д. Падасінаў, выкладчык В. М. Адзінцоў).

Калектыў факультэта фізічнага выхавання (дэкан—дацэнт Б. М. Зайцаў) за распрацоўку і ўкараненне навукова абгрунтаваных метадаў арганізацыі і ўдасканалення заняткаў па фізічнай культуры і спорту студэнтаў узнагароджаны дыпломам удзельніка ВДНГ СССР.

Экспанаты, удастоеныя медалёў, рэкамендаваны на міжнародную выстаўку «Савецкія універсітэты», якая будзе праходзіць у маі-чэрвені бягучага года ў сталіцы Балгарыі — г. Сафія.

## ЛЕНІНСКІЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ—ГОНАР УНІВЕРСІТЭТА

На матэматычным факультэце ёсць нямала студэнтаў, якія настойліва авалодваюць выбранай прафесіяй, актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці. Адной з такіх з'яўляецца Валянціна Малашанка — будучы матэматык-праграміст. Яна ўжо вучыцца на 4-ым курсе. У заліковай кніжцы камсамолкі толькі выдатныя адзнакі. Цяпер Валянціна адказвае на факультэце за студэнцкую навуковую работу. Яна многае робіць, каб кожны студэнт з большай зацікаўленасцю пранікаўся матэматычнай навукай.

На факультэце аб В. Малашанка гавораць як аб адной з самых сціплых і працалюбівых студэнтак. Любое даручэнне яна выконвае якасна і ў тэрмін. На высокім узроўні Валянціна правяла і студэнцкую алімпіяду матэматыкаў.



**На здымку: ленінская стыпендыятка В. Малашанка ў вольны ад заняткаў час.**

Фота С. Коваля.

## НА АРБІЦЕ — МІЖНАРОДНЫ ЭКІПАЖ

**ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС**

**3 красавіка 1984 года ў 17 гадзін 09 мінут маскоўскага часу ў Савецкім Саюзе ажыццёўлен запуск касмічнага карабля «Саюз Т-11».**

**Савецкі касмічны карабель пілатуе міжнародны экіпаж: камандзір карабля Герой Савецкага Саюза, лётчык-касманаўт СССР Юрый Малышаў, бортінжынер Герой Савецкага Саюза, лётчык-касманаўт СССР Генадзій Стракалаў і касманаўт-даследчык грамадзянін Рэспублікі Індыі Ракеш Шарма.**

**Палёт савецка-індыйскага экіпажа ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дагаворанасцю паміж урадамі Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і Рэспублікі Індыі.**

**4 красавіка 1984 года праведзена стыкоўка касмічнага карабля «Саюз Т-11» з арбітальным комплексам «Салют-7» — «Саюз Т-10».**

**У калязямной касмічнай прасторы на борце навукова-даследчага комплексу «Салют-7» — «Саюз Т-10» — «Саюз Т-11» працуе міжнародны экіпаж у саставе шасці чалавек: савецкія касманаўты Леанід Кізім, Уладзімір Салаўёў, Алег Ацькоў, Юрый Малышаў, Генадзій Стракалаў і касманаўт Рэспублікі Індыі Ракеш Шарма.**

**Праграма навуковых даследаванняў, распрацаваная сумесна вучонымі Савецкага Саюза і Індыі, разлічана на сем дзён.**

## НА РАХУНАК КАМУНІСТЫЧНАГА СУБОТНІКА

Два тыдні засталося да Усесаюзнага свята працы — камуністычнага суботніка, прысвечанага 114-ай гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Аднак ужо ў мінулы аўторак студэнты універсітэта заступілі на ўдарную працу: 25 слухачоў падрыхтоўчага аддзялення і першакурснікаў фізічнага факультэта капалі траншэю да будынка будучага малочнага бара, які знаходзіцца на перакрыжаванні вуліц Ланге і Савецкая. У сераду тут працавалі другакурснікі, а ў чацвер — студэнты трэцяга курса фізічнага факультэта. Усе работы аднесліся да даручанай справы з пачуццём высокага грамадзянскага абавязку.

*Насустрач знамянальнаму юбілею*

## КОЖНАМУ СТУДЭНТУ— ЗНАЧОК ГПА

Для беларускага народа з кожным днём набліжаецца знамянальнае свята — 40-годдзе вызвалення нашай рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Да гэтай знамянальнай даты вядзецца актыўная падрыхтоўка. Свой дастойны падарунак гістарычнаму юбілею рыхтуе і студэнцкая моладзь. Наш пярвейшы абавязак сустрэць яго выдатнай вучобай, плённай грамадскай дзейнасцю. І яшчэ адна вельмі важная задача стаіць перад моладдзю. Яна вынікае з пастановы ЦК ЛКСМБ аб падрыхтоўцы і святкаванні 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У адпаведнасці з гэтай пастановай у рэспубліцы са студзеня па ліпень 1984 года праводзіцца экзамен сярод камсамольцаў і моладзі па комплексу ГПА.

Асноўная мэта экзамена —кожнаму члену ВЛКСМ у гонар 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў поўнасцю здаць нарматывы і стаць значкістамі комплексу ГПА. Галоўная задача—шырэй далучаць камсамольцаў і моладзь да пастаянных заняткаў фізкультурай і спортам, рыхтаваць яе да высокапрадукцыйнай працы і абароны Радзімы.

Экзамен уключае наступныя віды спорту і тэарэтычныя раздзелы, якія ўваходзяць у праграму Усесаюзнага комплексу ГПА: лыжныя гонкі, спартыўная стральба, гімнастыка, лёгкаатлетычны крос, бег на 100 м, кіданне гранаты, плаванне; грамадзянская абарона, фізічная культура і спорт у СССР, асабістая і грамадская гігіена, ранішняя гімнастыка.

Па зімовых відах спорту спаборніцтвы, як вядома, ужо адбыліся. Многія іх удзельнікі паказалі высокія вынікі. У прыватнасці, асабліва паспяхова выступалі лыжнікі геалагічнага факультэта.

**Цяпер экзамен уступае ў заключны этап. Таму ўсім студэнтам неабходна актыўна ўключыцца у яго здачу. У гэтай сувязі вялікую работу абавязаны правесці адказныя за фізкультурна-масавую работу на факультэтах. Трэба своечасова даваць інфармацыю ў камітэт камсамола ГДУ і для экрана хода экзамена.**

**Наш пачэсны абавязак — зрабіць усё неабходнае, каб юбілейны год вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў стаў годам самага масавага далучэння студэнтаў да заняткаў фізічнай культурай, каб кожны з іх сёлета абавязкова стаў значкістам ГПА.**

**С. МАЛЫКІН,**
**член камітэта ЛКСМБ, адказны за спартыўна-масавую работу ГДУ.**

## УНІВЕРСІТЭЦКАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

У апошняй дэкадзе сакавіка прайшла чарговая XII навуковая канферэнцыя прафесарска-выкладчыцкага саставу ГДУ па выніках навукова-даследчай работы за 1983 год. Працавалі секцыі грамадскіх, эканамічных, гістарычных, філалагічных навук, педагогікі і псіхалогіі, матэматычных, фізічных, геолага-мінералагічных, біялагічных навук, фізічнага выхавання і спартыўнай медыцыны. Было заслухана і абмеркавана каля 400 навуковых дакладаў. З імі выступілі вядучыя вучоныя і выкладчыкі ўсіх кафедр, навуковыя работнікі і аспіранты. Значная колькасць дакладаў была падрыхтавана да канферэнцыі ў сааўтарстве са студэнтамі.

## НА ЧАРГОВЫХ ЗАНЯТКАХ

Партыйны камітэт універсітэта кожны месяц праводзіць вучобу сакратароў пярвічных партыйных арганізацый структурных падраздзяленняў. На мінулым тыдні адбылiся чарговыя заняткі. Сакратар парткома М. І. Старавойтаў выступіў па пытанню аб кантролі і праверцы выканання прымаемых рашэнняў і пастаноў партыйнай арганізацыі універсітэта.

Абмеркавана таксама пытанне аб правядзенні атэстацыі па грамадска-палітычнай практыцы студэнтаў.

## ЗДАЮЦЬ ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКЗАМЕН

Усё менш і менш часу застаецца ў сёлетніх выпускнікоў, калі яны з хваляваннем і прыемным сумам будуць развітвацца з універсітэтам, выкладчыкамі, сябрамі. Вядомы ужо месцы, дзе давядзецца працаваць. А пакуль што клопаты аб тым, каб паспяхова вытрымаць дзяржаўныя экзамены і абараніць дыпломныя работы.

У красавіку пачалі здаваць дзяржаўны экзамен па навуковаму камунізму пяцікурснікі эканамічнага факультэта. Экзаменатара і членаў ДЭК яны радуюць глыбокімі ведамі. Так, у групе 0-51 11 студэнтаў з 21 атрымалі выдатныя адзнакі, 9— добрыя і толькі адна адзнака — здавальняючая.

Высокія балы на экзамене па навуковаму камунізму атрымалі і студэнты групы Т-51.

(Наш кар.).

## АБМЕРКАВАЛІ КАМУНІСТЫ

4-га красавіка на фізічным факультэце адбыўся партыйны сход. Абмеркавана пытанне «Вынікі чарговага (1984 г.) Пленума ЦК КПСС і задачы партыйнай арганізацыі факультэта, вынікаючыя з палажэнняў і высноў, якія ўтрымліваюцца ў прамове Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша К. У. Чарненкі». З дакладам выступіла сакратар партыйнага бюро Т. П. Жалонкіна.

Па абмеркаванаму пытанню прынята адпаведная пастанова.

*Да Ленінскага ўрока*

# ЗВЯРАЦЬ ЖЫЦЦЁ ПА ЛЕНІНУ

Ленінскі ўрок з'яўляецца формай калектыўнай парады з Ільічом па актуальных пытаннях сучаснасці, дае магчымасць яго ўдзельнікам звяраць ленінскія ідэі са сваімі планамі і справамі, высветліць, як выконваюцца запаветы і наказы У. І. Леніна моладдзю, садзейнічае пераўтварэнню палітычных **ведаў ў ідэйныя перакананні** камсамольцаў.

Эфектыўнасць Ленінскага ўрока, яго ўплыў на жыццё калектыву ў цэлым і на кожнага камсамольца залежыць ад творчага падыходу да яго арганізацыі. Галоўным у Ленінскім уроку заўсёды з'яўляецца творчае авалоданне ленінізмам, выпрацоўка ў юнакоў і дзяўчат умення кіравацца ленінскімі ідэямі, рашэннямі партыі і ўрада ў сваім паўсядзённым жыцці. Зыходзячы з гэтага, пры падрыхтоўцы трэба прытрымлівацца наступных прынцыпаў: па-першае, абавязкова вывучаць рэкамендаваныя творы У. І. Леніна, дакументы КПСС, ВЛКСМ, па-другое, улічваць фактычнае становішча, вынасімыя на абмеркаванне пытанні ў пярвічных арганізацыях, крытычны аналіз, ацэнку ролі кожнага камсамольца і ўсяго калектыву ў іх рашэнні, па-трэцяе, выпрацоўка канкрэтных мерапрыемстваў, накіраваных на павышэнне грамадска-палітычнай актыўнасці моладзі.

У красавіку ў камсамольскіх арганізацыях усіх факультэтаў універсітэта ў ходзе Усесаюзнай ленінскай праверкі пройдзе Ленінскі **ўрок «60 гадоў з імем Леніна»**.

### ПРЫКЛАДНЫ ПЛАН ПРАВЯДЗЕННЯ ЎРОКА

Жыццё і дзейнасць У. І. Леніна, рэвалюцыйныя і працоўныя традыцыі партыі, урада і камсамола — выдатная школа выхавання новых пакаленняў маладых барацьбітоў за камунізм.

Прамова Леніна на III з'ездзе камсамола — важнейшы тэарэтычны дакумент партыі і ролі моладзі ў будаўніцтве новага грамадства, праграма камуністычнага выхавання маладога пакалення, Ленінскі запавет «вучыцца камунізму», яго сэнс, змест у сучасных умовах.

Развіццё ленінскага вучэння аб моладзі ў дакументах і рашэннях КПСС. У. І. Ленін аб ролі камсамола ў будаўніцтве сацыялізму і камунізму.

XXVI з'езд КПСС аб ролі ВЛКСМ як рэзерва і бліжэйшага памочніка партыі ў камуністычным выхаванні падрастаючага пакалення.

КПСС аб узрастанні ролі камсамола ў камуністычным будаўніцтве. ВЛКСМ, савецкая моладзь у барацьбе за ажыццяўленне рашэнняў XXVI з'езда КПСС.

Удзел камсамольцаў і моладзі ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве, у выкананні заданняў XI пяцігодкі.

XIX з'езд ВЛКСМ аб асноўных напрамках дзейнасці камсамольскіх арганізацый па выкананню пастаўленых партыяй задач.

ВЛКСМ — баявы атрад міжнароднага камуністычнага і дэмакратычнага маладзёжнага руху.

60-годдзе прысваення камсамолу імя Леніна — яркае сведчанне беззапаветнага служэння Радзіме ўсіх пакаленняў савецкай моладзі.

### ЛІТАРАТУРА:


Ленін У. І. Аб моладзі. — М.: «Маладая гвардыя», 1974 г.

Ленін У. І. «Задачы Саюзаў моладзі». Прамова на III Усерасійскім з'ездзе Расійскага Камуністычнага Саюза Моладзі 2 кастрычніка 1920 г. Т. 41, с. 298—318.

Матэрыялы XXVI з'езда КПСС. — М.: Палітвыдат, 1982 г.

Харчовая праграма СССР на перыяд да 1990 года і мерах па яе рэалізацыі.

Матэрыялы майскага Пленума ЦК КПСС (1982 г.) — М.: Палітвыдат, 1982 г.

Вучыцца камунізму. У 2-х кнігах. — М.: Палітвыдат, 1982 г.

Брэжнеў Л. І. Клопат аб інтарэсах народа — справа гонару камсамола. Прамова на XIX з'ездзе ВЛКСМ, 18 мая 1982 г. — М.: Палітвыдат, 1982 г.

Пастухоў Б. В. «Аб выніках XXVI з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і задачах камсамольскіх арганізацый, якія выцякаюць з рашэнняў з'езда» — М.: «Маладая гвардыя», 1981 г.

Дакументы XIX з'езда ВЛКСМ. — М.: «Маладая гвардыя», 1982 г.

Мішын В. М. «Камсамол — надзейны памочнік і баявы рэзерв КПСС» — М.: «Веды», 1983 г.

Мішын В. М. «Засвоіць вопыт старэйшых пакаленняў, абагачаць яго асабістымі здзяйсненнямі». Даклад на VII Пленуме ЦК ВЛКСМ. — «Комсомольская правда», 20 сакавіка 1984 г.

Ільінскі І. М. «ВЛКСМ у палітычнай сістэме савецкага грамадства» — М.: 1981 г.

Аб выніках лютаўскага(1984 г.) Пленума ЦК КПСС і задачах камсамольскай арганізацыі ў святле палажэнняў і вывадаў, якія змяшчаюцца ў прамовах Генеральнага сакратара ЦК КПСС тав. К. У. Чарненкі на Пленуме ЦК КПСС і сустрэчы з выбаршчыкамі Куйбышаўскай выбарчай акругі г. Масквы. Пастанова VII Пленума ЦК ВЛКСМ.


*Навуку—вытворчасці*

# ШКОЛА ПЕРАДАВОГА ВОПЫТУ

Па ініцыятыве кафедры тэхнічных сродкаў апрацоўкі эканамічнай інфармацыі пры актыўным садзейнічанні абласнога савета НТТ і Гомельскага міжгаліновага тэрытарыяльнага цэнтра навукова-тэхнічнай інфармацыі створана абласная школа перадавога вопыту «Павышэнне эфектыўнасці выкарыстання тэхнічных сродкаў кіравання». Днямі ў ёй адбыліся першыя заняткі. Галоўная ўвага слухачоў школы была сканцэнтравана на практычных прыёмах павышэння эфектыўнасці выкарыстання электронна-вылічальнай тэхнікі. Вопытам пабудовы інфармацыйна-вылічальных сетак падзяліліся загадчык кафедры ТСАЭІ А. І. Іванюк, дацэнт У. С. Давыдаў, асістэнт М. І. Прахарэнка, аўтар гэтых радкоў. На занятках выступілі таксама начальнік адзела АСК ВА «Гідраааўмататыка» к. т. н. У. Б. Канцавенка і дырэктар галоўнага ІВЦ Галоўрэчфлоту УССР к. э. н. С. А. Аўчароў.

Карысным было наведванне Гомельскага куставога інфармацыйна-вылічальнага цэнтра ВТА «Аўтатранссістэма», дзе прадставілася магчымасць азнаёміцца з вопытам па тэхналогіі апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.

На занятках школы распрацаваны мерапрыемствы па павышэнню эфектыўнасці выкарыстання тэхнічных сродкаў кіравання. У перспектыве прадугледжана надаць сістэматычны характар абмену перадавым вопытам па будове інфармацыйна-вылічальных сетак.

**Г. КОТАЎ,**
**кіраўнік школы, дацэнт кафедры ТСАЭІ.**

*Гутаркі «за круглым сталом»*

# ПА АКТУАЛЬНЫХ ПЫТАННЯХ

Сталі рэгулярнымі сустрэчы выкладчыкаў кафедры палітэканоміі са студэнтамі, якія жывуць у інтэрнатах. На гэты раз 30 сакавіка вечар-сустрэча адбылася ў інтэрнаце № 4. Яе тэма — «Пытайце — адказваем». У студэнтаў яна выклікала павышаную цікавасць. У гутарцы па актуальных праблемах эканомікі сацыялізму, пытаннях знешняй і ўнутранай палітыкі КПСС і савецкага ўраада, асновах сямейных і ідэйна-маральных адносін у маладзёжным асяроддзі прыняло ўдзел больш 70 будучых эканамістаў, біёлагаў і геолагаў.

У даходлівай і папулярнай форме, у абстаноўцы добразычлівага жывога кантакту з аўдыторыяй на зададзеныя студэнтамі пытанні адказвалі загадчык кафедры палітэканоміі дацэнт У. Ф. Бондараў, намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце дацэнт Г. Д. Ветлугаеў, намеснік дэкана эканамічнага факультэта к. э. н. М. В. Герасімчык, дацэнт У. С. Дайнека, кандыдаты эканамічных навук Н. П. Пухава і А. С. Канашэвіч.

Студэнты неаднаразова ўступалі ў дыскусію з выкладчыкамі, удакладнялі і канкрэтызавалі пастаўленыя пытанні, імкнуліся максімальна выкарыстаць магчымасці вечара для павышэння свайго ідэйнага і агульнаадукацыйнага ўзроўню. Студэнтаў больш за ўсё цікавілі праблемы ўдасканальвання гаспадарчага механізму, напрамкі развіцця сацыялістычнай грамадскай уласнасці на сродкі вытворчасці, выкананне і перспектывы ажыццяўлення Харчовай праграмы СССР, магчымасці паляпшэння матэрыяльнага дабрабыту савецкага народа і г. д.

Разам з тым хацелася б адзначыць, што вопыт работы кафедры палітэканоміі са студэнцкай моладдзю ў інтэрнатах не знайшоў яшчэ належнага прызнання сярод другіх падраздзяленняў і грамадскіх арганізацый ГДУ. Было б вельмі карысна, каб у наступныя перыяды дзяжурствы кафедр у інтэрнатах ператварыліся ў дні цікавых і змястоўных сустрэч з вядучымі выкладчыкамі. Гэта, бясспрэчна, будзе садзейнічаць наладжванню непасрэднага кантакту са студэнтамі, акажа дапамогу ў павышэнні эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчага працэсу, будзе спрыяць росту ідэйнага і маральнага ўзроўню, фарміраванню актыўнай жыццёвай пазіцыі студэнцкай моладзі.

**У. ЗАРЭЦКІ,**
**аспірант кафедры палітэканоміі.**

**М. СІВЕНКА,**
**старшыня студсавета інтэрната № 4.**

**НАСУСТРАЧ ПРАЦОЎНАМУ СЕМЕСТРУ-84**

# РЫХТУЕМСЯ ЎСЕБАКОВА

Кожны дзень набліжае нас не толькі да галоўнага выпрабавання — пераваднной залікова-экзаменацыйнай сесіі, але і да трэцяга працоўнага семестра. Байцы нашга атрада заклапочаны тым, каб паспяхова здаць усе залікі і экзамены, затым прайсці піянерскую практыку і з добрым настроем выехаць на месца дыслакацыі. А працаваць мы будзем у саўгасе «Судкова» Хойніцкага раёна. Тут на працягу месца акажам дапамогу сельскім працаўнікам у выкананні важнейшых работ, унясём свой хоць і невялічкі ўклад у ажыццяўленне Харчовай праграмы.

Працоўны семестр мы імкнемся сустрэць у поўнай гатоўнасці. Байцы паказалі добрыя веды на экзамене па тэхніцы бяспекі, адной з лепшых прызнана наша агітбрыгада на універсітэцкім аглядзе. Да выступленняў перад рабочымі саўгаса і вясковай моладзі рупліва рыхтуюцца атрадныя лектары. Па рэкамендуемай тэматыцы яны падабралі лекцыі і стараюцца глыбока засвоіць іх.

Хапае спраў і рэдкалегіі. Выпускаемыя ёй насценныя газеты атрымоўваюцца цікавымі, змястоўнымі, прыцягваюць увагу многіх студэнтаў.

Гэта толькі падрыхтоўка. Галоўнае — працоўны перыяд. Наш атрад поўны рашучасці правесці яго з максімальнай аддачай сіл і заняць высокае месца ў сацыялістычным спаборніцтве сельскагаспадарчых атрадаў універсітэта.

**Т. ЖЫГАР,**
**камісар адтрада «Алеся» матэматычнага факультэта.**

*На аснове творчага супрацоўніцтва*

●

# ПРЫЕМНАЕ ЗНАЁМСТВА

Мінула некалькі гадоў, як пачалі ўсталёвацца сувязі паміж нашым вучылішчам народных мастацкіх промыслаў і вядучай вышэйшай навучальнай установай Беларускага Палесся — Гомельскім дзяржаўным універсітэтам. Увесь час яны пашыраюцца і ўмацоўваюцца. Гэтаму ў значнай ступені садзейнічае заключаны дагавор аб сацыялістычным творчым супрацоўніцтве.

Днямі нашымі жаданымі гасцямі былі прадстаўнікі факультэта фізічнага выхавання: старшыя выкладчыкі суддзя ўсесаюзнай катэгорыі па баскетболу В. І. Селіванаў і М. А. Кульбакоў, студэнткі, майстры спорту міжнароднага класа чэмпіёнка свету па гімнастыцы ў камандных спаборніцтвах Алена Палявая і сярэбраны прызёр Еўропы па веславанню Таццяна Рычага.

Перад шматлікай аўдыторыяй з цікавым расказам «У вайны не жаночы твар» выступіў В. І. Селіванаў. Ад яго навучэнцы вучылішча даведаліся пра чатырох былых аднакласніц, выдатных спартсменках, гамяльчанках Галіне Дакутовіч, Паліне Гельман, Алене Мацвееве і Тамары Курыльчык, які ў суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны паказалі ўзоры мужнасці і гераізму, вернага служэння Радзіме.

Удзельнікі сустрэчы з цікавасцю слухалі расказ і М. А. Кульбакова аб спартыўных дасягненнях Гомельшчыны і спортклуба ГДУ, аб новых перспектывах развіцця спорту і фізічнай культуры, падрыхтоўцы нашых вядучых спарсменаў да важнейшых спаборніцтваў алімпійскага года.

Прысутныя цёпла віталі выступленні шырока вядомых спарсменак Алены Палявой і Таццяны Рычага, якія расказалі аб сваім шляху ў вялікі спорт, удзеле ў адказных спаборніцтвах, сустрэчах з правафланговымі савецкага спорту і праслаўленымі замежнымі спартсменамі.

Ва ўдзячнасць гасцям былі ўручаны кветкі і сувеніры, выраблены рукамі навучэнцаў вучылішча.

Прадстаўнікі універсітэта з задавальненнем азнаёміліся з вучылішчам, яго музеем і вырабляемай прадкуцыяй, якая ўжо неаднаразова дэманстравалася на разнастайных выстаўках, у тым ліку і на міжнародных, дзе атрымоўвала высокую адзнаку.

У папярэднія гады ў нашым вучылішчы педагагічную практыку пераважна праходзілі студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта. Пасля ж гэтай сустрэчы мы абавязкова будзем запрашаць да сябе на педпрактыку і старшакурснікаў факультэта фізвыхавання.

Рады вітаць у сябе таксама выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў фізічнага, матэматычнага і іншых факультэтаў. Думаецца, такія сустрэчы будуць карыснымі для абодвух бакоў.

**М. ВОІНАЎ,**
**дырэктар Гомельскага сярэдняга ГПТВ-126 народных мастацкіх промыслаў.**

*ВНУ — прафтэхадукацыі*

# КАРЫСЦЬ — УЗАЕМНАЯ

На працягу многіх гадоў існуе цеснае супрацоўніцтва паміж спецыялізуючай кафедрай фізіялогіі чалавека і жывёлін ГДУ і ўстановамі народнай асветы г. Гомеля. Выкладчыкі кафедры аказваюць навукова-метадычную і практычную дапамогу абласному інстытуту ўдасканалення настаўнікаў у арганізацыі чытання лекцый і правядзенні лабараторна-практычных заняткаў з настаўнікамі школ горада і вобласці. Пры кафедры дзейнічае гурток «Юны фізіёлаг», у якім займаюцца гомельскія школьнікі.

Новым мерапрыемствам кафедры па рэалізацыі праграмных установак чэрвеньскага (1983 г) Пленума ЦК КПСС і праекта ЦК КПСС «Асноўныя напрамкі рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы» з'явілася садружнасць паміж нашай кафедрай і Прыбарскім сярэднім сельскім прафтэхвучылішчам № 52, у якім вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў і лабарантаў для сельскагаспадарчых лабараторый. У заключаным дагаворы аб доўгатэрміновай сацыялістычнай садружнасці прадугледжваюцца мерапрыемствы, выкананне якіх будзе садзейнічаць удасканальванню вучэбна-выхаваўчага працэсу навучэнцаў, укараненню навуковых распрацовак супрацоўнікаў кафедры ў вучэбны працэс, абмену навукова-тэхнічнай інфармацыяй, эфектыўнасці прафарыентацыйнай работы.

У адпаведнасці з гэтым на базе лабараторый кафедры з навучэнцамі вучылішча праводзяцца лабараторна-практычныя заняткі па асваенню сучасных і найбольш шырока прымяняемых у лабараторыях біяхімічнага профілю прыбораў і метадаў фізіка-хімічнага аналізу (іонаметрыя, фотаметрыя, вагавы аналіз і г. д.). Заняткі з навучэнцамі праводзяць дацэнт В. С. Аруцюнава, асістэнты Н. І. Захарчанка, Т. Ю. Гілеп і іншыя выкладчыкі. Да правядзення заняткаў далучаюцца таксама старшы лабарант М. Г. Ляўіціна, студэнты-пяцікурснікі Н. Карпман, І. Вяргей, С. Багдановіч, В. Плаксіна, якія спецыялізуюцца па фізіялогіі чалавека і жывёлін, добра валодаюць метадамі біяхімічнага аналізу біяматэрыялаў. Прыцягненне студэнтаў старэйшых курсаў да правядзення заняткаў з навучэнцамі разглядаецца кафедрай як адна з важных форм актывізацыі самастойнай работы, іх пазнавальнай дзейнасці і павышэння іх прафесіянальнай падрыхтоўкі.



На здымку: навучэнцы Прыбарскага ССПТВ-52 у час экскурсіі знаёмяцца з лабараторыямі кафедры. Тлумачэнні дае асістэнт Н. І. Захарчанка.

У «Асноўных напрамках рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы» ў раздзеле па павышэнню якасці вучэбна-выхаваўчага працэсу сказана, што «разам з урокам — асноўнай формай вучэбнага працэсу — у старэйшых класах школ, у прафтэхвучылішчах і сярэдніх навучальных установах шырэй практыкаваць лекцыі, семінарскія заняткі, субяседаванні, практыкумы, кансультацыі». У гэтым плане кафедрай прадугледжана чытанне спецыяльных лекцый для навучэнцаў па відах біялагічна актыўных рэчываў, іх крыніцах, значэнні ў жыцці жывёл. Спалучэнне лекцый з лабараторна-практычнымі заняткамі і гутаркамі па цікавячых навучэнцаў пытаннях разам з павышэннем іх прафесіянальнай падрыхтоўкі садзейнічае фарміраванню у іх матэрыялістычнага светапогляду.

Творчае супрацоўніцтва паміж кафедрай і ССПТВ-52 будзе садзейнічаць паскарэнню ўкаранення некаторых навуковых распрацовак супрацоўнікаў кафедры у вучэбны працэс не толькі для студэнтаў, але і для навучэнцаў. Напрыклад, новы метад pH-метрычнага тітравання вадкасцей і прыстасаванне для яго ажыццяўлення, распрацаваныя на кафедры і апублікаваныя ў адным з навуковых часопісаў, плануецца ўкараніць у вучэбны працэс на кафедры і ў вучылішчы ў бягучым годзе.

У плане абмену навукова-тэхнічнай інфармацыяй супрацоўнікамі кафедры распрацоўваюцца метадычныя ўказанні па метадах фізіка-хімічнага аналізу, частка з якіх, найбольш адпавядаючых праграме падрыхтоўкі лабарантаў-хімікаў, перададзена вучылішчу.

Цесныя сувязі паміж кафедрай і вучылішчам дазваляюць супрацоўнікам кафедры больш актыўна праводзіць прафарыентацыйную работу сярод навучэнцаў, выкарыстоўваючы пры гэтым непасрэдна наглядныя дапаможнікі лабараторый кафедры, якія адлюстроўваюць вучэбны і навуковы працэс на кафедры, асаблівасці спецыялізацыі і размеркавання выпускнікоў на месца работы. У сваю чаргу адміністрацыя вучылішча, згодна дагавору, абавязваецца рэкамендаваць для паступлення на біялагічны факультэт лепшых сваіх выпускнікоў.

Пытанні вучэбна-метадычнай работы, планавання і арганізацыі правядзення сумесных мерапрыемстваў разглядаюцца на пасяджэнні кафедры з удзелам выкладчыкаў вучылішча.

Доўгатэрміновая сацыялістычная садружнасць паміж нашай кафедрай і Прыбарскім ССПТВ № 52 садзейнічае ўдасканальванню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

**А. КІЕНЯ,**
**загадчык кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін, дацэнт;**
**Б. ФРЭЙДЗІН,**
**загадчык педкабінета ССПТВ № 52.**

*СПОРТ*

## СПАБОРНІЧАЛІ АСІЛКІ

У балгарскім горадзе Перніку адбыліся міжнародныя спаборніцтвы па вольнай барацьбе. На барцоўскім дыване памераліся сіламі і савецкія асілкі. На іх долю дасталося чатыры вышэйшыя ўзнагароды. Пераможцам турніра ў вагавай катэгорыі 48 кг выйшаў студэнт факультэта фізвыхавання нашага універсітэта Н. Айвазян.

## ВА ЎПАРТАЙ БАРАЦЬБЕ

Першынство Белсавета ДСТ «Буравеснік» па фехтаванню па праграме спартакіяды ВНУ БССР 1984 года праведзена ў г. Брэсце. У асабістым заліку найбольш паспяхова выступалі і прынеслі залікoвыя ачкі нашаму універсітэту майстар спорту А. Падасінаў (член СК ГДУ), кандыдаты ў майстры спорту В. Хімакоў (факультэт фізвыхавання), Ю. Жураў (геалагічны факультэт), — усе шабля; майстар спорту В. Пятруша, кандыдаты ў майстры спорту А. Дагадай і Е. Паўловіч (члены СК ГДУ).

У камандных спаборніцтвах вызначыліся нашы шаблісты, якія занялі другое месца.

У агульным заліку пераможцамі сталі фехтавальшчыкі БПІ. Услед за імі ў турнірнай табліцы размясцілася каманда Брэсцкага дзяржаўнага педінстытута. Нашы спартсмены набралі 234 ачкі і занялі трэцяе месца.

**В. ЛІСОЎСКІ,**
**майстар спорту СССР, трэнер.**

## НА ПЕРШЫНСТВО УНІВЕРСІТЭТА

Завяршыліся гульні па баскетболу па праграме круглагадовай універсіяды. Сярод мужчын чэмпіёнам стала каманда факультэта фізвыхавання, на другім месцы — фізікі, трэцім — эканамісты.

Сярод жаночых каманд зноў пацвердзілі званне чэмпіёнак студэнткі эканамічнага факультэта, другім і трэцім прызёрам сталі адпаведна каманды факультэта фізвыхавання і матфака.

**П. САКОВІЧ,**
**галоўны сакратар спаборніцтваў.**

*Студэнтам — аб спецыялізацыях*

# ВАЖНАЯ ГАЛІНА ФІЗІКІ

Наша кафедра ажыццяўляе спецыялізацыю студэнтаў фізічнага факультэта па радыёфізіцы. Як тлумачыцца ў Вялікай Савецкай Энцыклапедыі, гэта — навука аб узбуджэнні, выпраменьванні, распаўсюджванні электрамагнітных хістанняў і хваль радыёдыпазона. Адсюль можна зрабіць вывад, што цяпер цяжка знайсці сферу дзейнасці, дзе б не змаглі знайсці прымянення сваім ведам спецыялісты-радыёфізікі.

Кафедра радыёфізікі рыхтуе кадры з ухілам, вызначаемым вывучэннем на 3—5 курсах наступных дысцыплін: асновы радыёэлектронікі, электрадынаміка СВЧ, тэорыя выпраменьвання і прыёму радыёхваль, тэорыя СВЧ-устройстваў, асновы радыёлакацыі, радыёфізічныя вымярэнні, лічбавая электроніка і радыёвымярэнні, інтэгральныя ўраўненні і тэорыя антэн, метрычная тэорыя антэнных рашотак, праграмаванне тыпавых задач радыёфізікі на ЭВМ.

Студэнты нашай спецыялізацыі тэарэтычныя веды замацоўваюць у васьмі па сучаснаму абсталяваных лабараторыях. На цяперашнім этапе лабараторныя работы камплексуюцца міні-ЭВМ, а таксама ажыццяўляецца пераход на паралельнае выкананне аднаіменных работ. Гэты метад навучання садзейнічае эфектыўнаму засваенню новага матэрыялу студэнтамі. Вопыт першай, пераведзенай у гэты рэжым лабараторыі радыёэлектронікі, паказаў: на аснове набору радыёэлектронных модуляў можна па прынцыпу дзіцячага канструявання сабраць любую электронную схему, пачынаючы ад лагічных элементаў да прасцейшых ЭВМ. Да паслуг студэнтаў — кафедральны вылічальны цэнтр, дзе ўстаноўлена 6 ЭВМ, пяць з якіх працуюць у рэжыме дыялогу.

Па студэнцкай навуцы кафедра радыёфізікі з года ў год займае ва універсітэце прызавыя месцы. Студэнты пастаянна ўдзельнічаюць у вынаходніцкай рабоце, у гарадскіх, рэспубліканскіх і ўсесаюзных выстаўках, канферэнцыях, конкурсах. Так, у мінулым годзе з пяці студэнцкіх навуковых работ тры атрымалі I катэгорыю і дзве — II. Двое студэнтаў сталі сааўтарамі вынаходніцтваў. Больш 80 працэнтаў курсавых і дыпломных работ выканана па рэальнай тэматыцы і рэкамендавана да ўкаранення. На ЭВМ кожным студэнтам спецыялізацыі «радыёфізіка» затрачваецца прыкладна па 40 гадзін пры сярэднім паказчыку па фізічным факультэце — 15 мінут.

Далучэнне студэнтаў да навукі стымулюецца наяўнасцю пры кафедры галіновай навукова-даследчай лабараторыі.

Большасць выпускнікоў, якія атрымліваюць спецыялізацыю на нашай кафедры, працуе ў навукова-даследчых арганізацыях і на прадпрыемствах Гомеля.

**І. ДАБРАВОЛЬСКІ,**
**загадчык кафедры радыёфізікі, дацэнт.**

*П'янству — бой!*

# ВЯСЁЛЫ ПАЧАТАК І СУМНЫ КАНЕЦ

Калі 4 снежня мінулага года аднакурснікі Барыс Чыркун і Віктар Паддубны не з'явіліся на заняткі, гэта нікога не ўстурбавала. Падумаеш, адсутнічаюць — з'ява на эканамічным факультэце яшчэ нярэдкая. Калі ж ў той дзень тут з'явіліся работнікі міліцыі, хутка папаўзлі ўсякія слухі, здагадкі. У тым, што Барыс Чыркун мог трапіць у міліцыю, выкладчыкаў і студэнтаў нікольі не здзіўляла. Да вучобы ён адносіўся нядбайна, ды і ў адносінах дысцыпліны хлопца іншы раз, як кажуць, заносіла на ўхабы.

Іншая рэч — Віктар Паддубны. Вучыўся добра, у сваёй групе з'яўляўся камсамольскім важаком. І адразу ніхто не верыў, што ён здольны на злачынства. Хадзілі меркаванні, што атрымалася нейкае непаразуменне.

Аднак ніякай памылкі не было. На лаву падсудных студэнтаў - трэцякурснікаў прывёў іх злачынны ўчынак. Ён стаў вынікам прыхільнасці абодвух да моцных напіткаў, якія не толькі павышаюць настрой, але і тлумяць мазгі, не дазваляюць у належных рамках кіраваць сабой.

Пачатак таго вечара ў Барыса і Віктара быў вясёлы. Знаходзіліся яны ў рэстаране «Зара». Нічым сябе тут не абмяжоўвалі. Пілі колькі лезла. І калі дружбакі па чарцы выкаціліся з рэстарана, іх адразу пацягнула на «подзвігі». На вуліцы Савецкай яны пачалі прыставаць да незнаёмай В. Буяны збілі яе з ног. Пацярпеўшая пачала клікаць на дапамогу. Тады Чыркун сарваў з яе паліто мехавы варатнік коштам 350 рублёў і разам са сваім «камсамольскім важаком» пусціўся наўцёкі.

Замесці сляды злачынства сабутэльнікам не ўдалося. Работнікі міліцыі затрымалі іх з «трафеем».

Пры следстве была поўнасцю ўстаноўлена віна Чыркуна і Паддубнага. Іх крымінальную справу разглядзеў народны суд Цэнтральнага раёна. Першы з іх асуджаны на тры з палавінай гады турэмнага зняволення, Паддубнаму давядзецца тры гады адпрацаваць на новабудоўлях краіны. Іх касацыйную скаргу абласны суд не задаволіў і прыгавор народнага суда пакінуў у сіле.

Яшчэ да суда Б. Чыркун і В. Паддубны былі выключаны з універсітэта і членаў ВЛКСМ. Так сумна закончылася для іх вясёлая гулянка.

Аднак ставіць кропку на гэтым яшчэ рана. Думаецца, што маральнае падзенне Чыркуна і Паддубнага, якое прывяло іх да цяжкага злачынства, з'явіцца прадметным урокам для кожнага, хто замест настойлівага авалодвання выбранай прафесіяй, студэнцкія гады прысвячае бяздзейнаму і нярэдка з пахмяленнем часаправаджэнню.

Папроку заслугоўвае і камітэт камсамола эканамічнага факультэта. Факты злачынства становяцца магчымымі менавіта з-за недастатковай выхаваўчай работы сярод студэнтаў. Трэба больш увагі і прынцыпова цікавіцца, чым займаюцца яны пасля заняткаў.

Асобныя студэнты слаба вучацца, не атрымоўваюць стыпендыю. Тым не менш сярод іх ёсць аматары выпіваць. Тут таксама ўзнікае пытанне: за якія кошты яны выпіваюць, або хто і за што іх частуе, а дакладней, атручвае дурманным пітвом?

Нарэшце, трэба строга пытаць вахцёраў, якія звычайна не звяртаюць увагі на студэнтаў пры іх з'яўленні ў інтэрнат «пад градусамі», і тым больш у начны час. Пра кожны такі выпадак павінны ведаць у дэканатах і неадкладна прымаць адпаведныя меры.

**Б. ВАЛОДЗІН.**

